Падтрымай "Вясну" на PATREON

Алег Корбан аштрафаваны на 805 рублёў за акцыю супраць аўтара «Рэгнума»

17.01.2017 **Тэгі**: адміністратыўны пераслед, свабода мірных сходаў



Акцыя ля галоўнага корпуса БДУІР у Мінску з расцяжкай «Выкладчык Паўлавец — здраднік!». Фота Радыё Свабода.

16 студзеня суд Савецкага раёна горада Мінска пакараў лідара грамадскага аб'яднання «Альтэрнатыва» Алега Корбана штрафам у памеры 35 базавых велічыняў (805 рублёў).

Па інфармацыі Радыё Свабода, такое пакараньне вынесла суддзя Наталля Драчова за ўдзел актывіста 9 снежня 2016 года ў несанкцыянаванай акцыі ля будынка БДУІР.


9 снежня дзясятак сяброў «Альтэрнатывы» прыйшлі да галоўнага корпуса БДУІР у Мінску з расцяжкай «Выкладчык Паўлавец — здраднік!». Такім чынам актывісты выказалі сваё стаўленьне да аўтара правакацыйных артыкулаў на сайце «Рэгнум».

Акцыю блякавалі дружыньнікі ўнівэрсытэту, а таксама некалькі грамадзян у цывільным, якія парвалі частку расцяжкі, а таксама ўзялі ў кола пратэстоўцаў. Акцыя завяршылася скандаваннем лёзунгаў «Ганьба!», «Не» — рускаму свету на Беларусі!».


Празь месяц аднаму з актыўных удзельнікаў акцыі Алегу Корбану была ўручаная копія адміністрацыйнага пратакола, складзенага паводле артыкула 23.34 КаАП, і позва ў суд.

Твитнуть









Чатырох жыхароў Паставаў асудзілі да "хатняй хіміі" за фотаздымак з Маршу (дапоўнена)

Заява праваабаронцаў аб прызнанні 20 палітычных зняволеных

ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА

У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў

"Усё зроблена, каб паралізаваць тваю волю", — былая палітзняволеная Вольга Класкоўская

"Гэта ўсё адно велізарнае злачынства супраць чалавечнасці", — былы палітвязень шклоўскай калоніі

"Мораць голадам і холадам". Новыя сведчанні пра катаванні і акалічнасці смерці Вітольда Ашурка ў ПК-17

ГАЛОЎНАЕ

"Я, напэўна, проста памру тут": хто з палітвязняў знаходзіцца ў асаблівай рызыцы за кратамі







АПОШНІЯ НАВІНЫ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік 2023

Валерыя Цапкалу завочна асудзілі да 17 гадоў калоніі ўзмоцненага рэжыму (дапоўнена)

Запрашаем на прэзентацыю дакладу “Абмежаванне свабоды выказвання меркаванняў пад выглядам барацьбы з экстрэмізмам і тэрарызмам” у Вільні

Палітзняволенай Вікторыі Кульшы ў трэці раз дадалі тэрмін па крымінальнай справе

Мужчыну асудзілі на два гады калоніі па двух дыфамацыйных артыкулах

Паўтара года калоніі прысудзілі экс-кандыдату ў прэзідэнты Андрэю Дзмітрыеву


У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў

Дырэктару газеты "Белорусы и рынок" Канстанціну Залатых прысудзілі чатыры гады калоніі

Да пяці гадоў калоніі. Асудзілі палітвязняў, якія вывесілі нацыянальныя сцягі Беларусі і Украіны

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік 2023



Рэферэндум 2022





ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская інтэрнэт-бібліятэка

СЯБРОЎСТВА

ENEMO

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK


















E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY